Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 7. Варыянт 5**

## Білет №7. Практычнае заданне. Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у другой палове 1940-х-1980-ыя гг.

**Заданні склала:**Непагадзь Тамара Мікалаеўна ДУА «Негарэльская сярэдняя школа №1» Дзяржынскага раёна Менскай вобласці

***Вывучыце крыніцы і адкажыце на пытанні.***
Пытанне.1. Ахарактарызуйце з апорай на гістарычныя крыніцы, якія змены адбыліся ў 1940-1980гг. у сацыяльна-эканамічным развіцці БССР?
2. Вызначыце супярэчлівыя моманты сацыяльна-эканамічнага развіцця БССР.
3.Вызначце, чаму 1980-ыя гады не ўдалося забяспечыць высокі ўзровень жыцця насельніцтва БССР?
4. Вызначце прычынна-выніковую сувязь паміж падзеннем узроўня сельскай гаспадаркі ўзнікненнем экалагічных праблем.

**Крыніца 1**



*Помнік стваральнікам самазвалаў каля завода БелАЗ у Жодзіне.*

**Крыніца 2**

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі




*Забруджванне тэрыторыі Беларусі*

## Крыніца 3

«Сцяпан Гардзеевіч Скарапанаў (1910—1999). Нарадзіўся на Гомельшчыне, скончыў Горацкі сельскагаспадарчы інстытут (цяпер - Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія). У верасні 1939 г. быў прызваны на службу ў Чырвоную Армію. Ужо падчас вайсковай службы абараніў дысертацыю на ступень кандыдата сельскагаспадарчых навук. У гады Вялікай Айчыннай вайны прайшоў шлях ад салдата да падпалкоўніка, удзельнічаў у абароне Масквы і Ленінграда, у вызваленні Варшавы і штурме Берліна. Як вучоны лічыў, што Беларусь не гатова да маштабнай меліярацыі, а праводзіць яе трэба з абавязковым угнаеннем асушаных зямель. Нажаль, яго пазіцыя не была ў поўнай меры ўлічана. У 1961-1972 гг. займаў пасаду міністра сельскай гаспадаркі БССР, стаў акадэмікам. За гэты час прадукцыя сельскай гаспадаркі БССР павялічылася на 40 працэнтаў, а вытворчасць збожжа - больш чым напалову. У сваёй прафесійнай дзейнасці кіраваўся прынцыпам: «Не той араты, хто добра арэ, а той, хто ворыва сваёй любуецца».